Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
___________________ Ю.П.Бондар
«____» ________________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/ вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11- 04 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка),*
*спецыялізацыі 1-23 01 11-04 01Беларуская мова і літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнікі:**

*В.С. Варапаева*, прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*В.В. Шунейка*, старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*Н.А. Ляйко*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;

*І.М.Саматыя,* дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 27.04. 2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В. С. Варапаева*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратуры» мае важнае значэнне ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў па напрамку 1-23 01 11-04 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка). За кошт пашырэння агульнагуманітарных і спецыяльных ведаў студэнтаў удасканальваецца прафесійная падрыхтаванасць будучага спецыяліста.

*Мэта* курса – тэарэтычна і практычна падрыхтаваць студэнтаў да выкладання беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе, улічваючы сучасныя дасягненні псіхолага-педагагічнай, лінгваметадычнай і літаратуразнаўчай навукі.

Галоўныя *задачы* курса методыкі выкладання беларускай мовы:

– даць сістэматызаваныя тэарэтычныя веды пра лінгвадыдактычныя асновы працы настаўніка ў вучэбных установах рознага тыпу пры вывучэнні курса беларускай мовы;

– азнаёміць студэнтаў з сучаснымі падыходамі да арганізацыі выкладання розных раздзелаў беларускай мовы;

– сфарміраваць навыкі самастойнай работы студэнтаў з навуковай і навукова-метадычнай літаратурай, неабходнай для ўдасканалення ўзроўню выкладання беларускай мовы на сучасным этапе;

– развіць у студэнтаў прафесійна-метадычныя ўменні фарміраваць у школьнікаў як лінгвістычную, моўную, этнакультурную, так і маўленчую, камунікатыўную кампетэнцыю.

*Змест* курса «Методыка выкладання беларускай мовы»: методыка выкладання беларускай мовы як навучальная дысцыпліна, яе прадмет і задачы, этапы развіцця ў Беларусі; агульныя пытанні навучання беларускай мове (мэта, задачы, прынцыпы і метады выкладання беларускай мовы; тыпы ўрокаў беларускай мовы); методыка вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы (методыка выкладання фанетыкі і арфаэпіі; методыка навучання арфаграфіі; методыка вывучэння лексікі і фразеалогіі; методыка выкладання марфемікі і словаўтварэння; методыка навучання марфалогіі; методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі; развіццё звязнай вуснай і пісьмовай мовы вучняў на ўроках мовы); арганізацыя пазакласнай работы па беларускай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты павінны *ведаць:*

– змест і задачы методыкі выкладання беларускай мовы, гісторыю яе развіцця;

– канцэпцыю моўнай адукацыі: мэту, змест, прынцыпы навучання;

– школьныя праграмы і падручнікі, іх змест і асаблівасці пабудовы; нарматыўную базу;

– тыпы і віды ўрокаў па беларускай мове;

– сучасныя метады і прыёмы выкладання раздзелаў беларускай мовы;

– сучасныя падыходы да арганізацыі выкладання беларускай мовы ў школе;

– улік і ацэнку ведаў вучняў;

– тыпы і формы пазакласных і пазашкольных заняткаў па беларускай мове.

Студэнты павінны *ўмець:*

– прымяняць на практыцы набытыя тэарэтычныя веды;

– аналізаваць падручнікі, праграмы з мэтай павышэння эфектыўнасці выкладання беларускай мовы;

– ствараць планы-канспекты ўрокаў па беларускай мове;

– валодаць сучаснымі тэхналогіямі навучання, якія дапамагаюць раскрыць творчы патэнцыял школьніка;

– выконваць метадычны аналіз матэрыялу, які выкарыстоўваецца пры навучанні школьнікаў беларускай мове;

– праводзіць урокі па беларускай мове ў адпаведнасці з працэсам засваення вучэбнага матэрыялу;

– праводзіць апытванне і аб’ектыўна ацэньваць веды, уменні і навыкі школьнікаў;

– творча выкарыстоўваць перадавы вопыт настаўнікаў-практыкаў.

Дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» цесна звязана з дысцыплінамі «Педагогіка», «Псіхалогія», «Сучасная беларуская літаратурная мова», «Асновы культуры мовы і стылістыкі» і інш.

*Змест* курса «Методыка выкладання беларускай літаратуры»: асноўныя этапы літаратурнай адукацыі; шляхі развіцця методыкі беларускай літаратуры; прынцыпы, метады, новыя педагагічныя тэхналогіі навучання; віды ўрокаў, этапы вывучэння мастацкага твора, прыёмы аналізу літаратурнага твора ў сярэдняй школе; асаблівасці вывучэння на ўроку літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкіх твораў у іх жанравай спецыфіцы; вывучэнне тэорыі літаратуры ў школьным курсе літаратуры; развіццё мовы вучняў у працэсе літаратурнай адукацыі; літаратурная творчасць школьнікаў; пазакласная і пазашкольная работа па беларускай літаратуры.

*Задачы* вывучэння прадмета:

– раскрыць спецыфіку і асноўныя заканамернасці развіцця «Методыкі выкладання беларускай літаратуры» як навукі;

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі этапамі літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе;

– даць уяўленне пра сучасны ўрок літаратуры, прынцыпы, метады, тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца на ім;

– дапамагчы аваладаць прыёмамі аналізу мастацкага твора ў яго жанравай спецыфіцы;

– садзейнічаць рэалізацыі набытых тэарэтычных ведаў на практыцы.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен *ведаць:*

– змест і задачы методыкі выкладання беларускай літаратуры, гісторыю яе развіцця;

– асноўныя прафесійныя патрабаванні да настаўніка літаратуры;

– вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры;

– прынцыпы і метады выкладання літаратуры;

– тыпы і віды ўрокаў па літаратуры;

– сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па беларускай літаратуры;

– віды планавання працы настаўніка-славесніка;

– улік і ацэнку ведаў вучняў;

– асноўныя патрабаванні да аналізу мастацкага твора, метады, прыёмы, шляхі яго вывучэння;

– ролю тэорыі літаратуры ў адукацыйным працэсе;

– віды, формы пазакласных і пазашкольных заняткаў па літаратуры.

Студэнты павінны *ўмець:*

– прымяняць на практыцы набытыя тэарэтычныя веды;

– планаваць урокі літаратуры (каляндарнае, перспектыўнае, бягучае планаванне);

– ствараць планы-канспекты ўрокаў;

– праводзіць урокі літаратуры ў адпаведнасці са спецыфікай мастацкіх твораў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– аналізаваць мастацкія творы ў адзінстве зместу і формы;

– прымяняць новыя тэхналогіі ў навучанні літаратуры ў вучэбным працэсе;

– ацэньваць веды і ўменні вучняў.

Дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай літаратуры» цесна звязана з гуманітарнымі прадметамі: «Беларуская літаратура», «Літаратуразнаўства», «Тэорыя літаратуры», «Псіхалогія і педагогіка», «Эстэтыка».

Пры вывучэнні курса рэкамендуецца выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі навучання і прынцыпы параўнальна-гістарычнага, культурна-гістарычнага, структурна-семантычнага і тыпалагічнага метадаў.

Адпаведна з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратуры» адведзена 190 гадзін, з якіх 80 гадзін аўдыторныя. Па відах заняткаў: лекцыі – 48 гадзін, семінары – 16 гадзін, практычныя – 16 гадзін. Вывучэнне курса рэкамендуецца завяршаць экзаменам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. | практ |
| **Раздзел I. Методыка выкладання беларускай мовы** | | | | |
| *Тэма 1.* Методыка выкладання беларускай мовы як навуковая дысцыпліна, яе прадмет і задачы. Станаўленне метадычнай думкі ў Беларусі | 2 | 2 | | |
| *Тэма 2.* Праграмы і сродкі навучання роднай мове | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Прынцыпы, метады і прыёмы навучання роднай мове | 2 | 2 | | |
| *Тэма 4.* Планаванне праграмнага матэрыялу па беларускай мове. Арганізацыя выкладання беларускай мовы ў школе | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 5.* Вывучэнне фанетыкі і арфаэпіі | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 6.* Вывучэнне лексікі і фразеалогіі | 2 | 2 | | |
| *Тэма 7.* Асноўныя метады і прынцыпы навучання арфаграфіі | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 8.* Выкладанне марфемікі і словаўтварэння | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 9.* Задачы і мэты навучання марфалогіі | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 10.* Вывучэнне сінтаксісу і пунктуацыі | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 11.* Развіццё звязнай вуснай і пісьмовай мовы вучняў на ўроках мовы | 4 | 2 | | 2 |
| *Тэма 12.* Методыка пазакласнай работы і факультатыўныя заняткі па беларускай мове | 2 | 2 | | |
| **Раздзел II. Методыка выкладання беларускай літаратуры** | | | | |
| *Тэма 13.* Методыка выкладання беларускай літаратуры як навуковая дысцыпліна | 2 | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 14.* Настаўнік і вучні на ўроках літаратуры. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры | 2 | 2 | | |
| *Тэма 15.* Прынцыпы і метады выкладання беларускай літаратуры. Тыпы і віды ўрокаў па літаратуры | 8 | 2 | 2 | 4 |
| *Тэма 16.* Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па беларускай літаратуры. Планаванне працы настаўніка. Улік і ацэнка ведаў | 6 | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 17.* Аналіз мастацкага твора на ўроках літаратуры. Метады і прыёмы | 2 | 2 | | |
| *Тэма 18.* Шляхі аналізу мастацкага твора | 6 | 4 | 2 | |
| *Тэма 19.* Вывучэнне твораў розных жанраў | 6 | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 20.* Вывучэнне тэорыі літаратуры | 2 | 2 | | |
| *Тэма 21.* Факультатыўныя заняткі па літаратуры | 2 | 2 | | |
| *Тэма 22.* Пазакласная і пазашкольная работа па беларускай літаратуры. Нагляднасць на ўроках літаратуры і ў пазакласнай рабоце | 2 | 2 | | |
| *Тэма 23.* Развіццё маўлення вучняў на ўроках літаратуры | 2 | 2 | | |
| **Разам…** | **80** | **48** | **16** | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел I. Методыка выкладання беларускай мовы

### *Тэма 1. Методыка выкладання беларускай мовы як навуковая дысцыпліна, яе прадмет і задачы. Станаўленне метадычнай думкі ў Беларусі*

Методыка выкладання беларускай мовы як навука аб навучанні і выхаванні школьніка як моўнай асобы; аб’ект, прадмет, змест, задачы, фундаментальныя паняцці і катэгорыі (мэты і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы і заканамернасці навучання мове, моўнае ядро асобы школьніка, моўная, маўленчая, сацыякультурная кампетэнцыі).

Змест методыкі. Метады даследавання. Сувязь методыкі з іншымі навукамі: філасофіяй, псіхалогіяй, педагогікай (у тым ліку дыдактыкай), лінгвістыкай, псіхалінгвістыкай, сацыялінгвістыкай, літаратуразнаўствам і інш. З гісторыі метадычнай думкі. Асветніцкія традыцыі Ф.Скарыны. «Граматыка славенска» І.Ужэвіча. «Беларуская граматыка для школ» Б.Тарашкевіча. Падручнікі Цёткі, Б.Пачобкі, Я.Лёсіка і інш. Метадычная спадчына К. Міцкевіча і В. Тэпіна.

Развіццё метадычнай думкі ў 60–80-я гг. Роля Л.П. Падгайскага, В.У. Протчанкі, У.К. Андрэенкі, М.С. Яўневіча, Я.М. Лаўрэля, М. Г. Яленскага, С. А. Язерскай і інш. у развіцці методыкі выкладання беларускай мовы. Развіццё метадычнай думкі ў 90-я гг. ХХ ст. і пачатку ХХІ ст. Беларускія педагагічныя часопісы («Роднае слова», «Беларуская мова і літаратура ў школе» і інш.), іх роля ў асэнсаванні і распаўсюджанні педагагічнай тэорыі і перадавога педагагічнага вопыту.

### *Тэма 2. Праграмы і сродкі навучання роднай мове*

Сістэма размяшчэння матэрыялу ў праграмах, сувязь паміж раздзеламі. Размеркаванне матэрыялу па гадах навучання. Лінейна-ступеньчаты і лінейны прынцыпы пабудовы праграмы.

Падручнік па беларускай мове, змест, прынцып пабудовы. Структурныя кампаненты падручніка па мове для школ: тэкставы (навукова-тэарэтычны, практычны матэрыял), пазатэкставы (апарат арганізацыі засваення матэрыялу, ілюстрацыі, малюнкі, схемы, табліцы, памяткі і інш.), даведачны (слоўнікі),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апарат арыенціроўкі (умоўныя абазначэнні, змест). Характарыстыка тэарэтычнага матэрыялу: лагічнасць і даступнасць фармулёвак, выразнасць ілюстрацыйнага матэрыялу, выдзяленне галоўнага. Характарыстыка практычнай часткі: дасканаласць метадычнага апарату, мэтазгоднасць практыкаванняў, тып матэрыялу (словы, сказы, звязныя тэксты). Функцыі падручніка: інфармацыйная, трансфармацыйная, сістэматызаваная, навучальная, развіццёвая, выхаваўчая. Вучэбныя і метадычныя дапаможнікі па беларускай мове.

### *Тэма 3. Прынцыпы, метады і прыёмы навучання роднай мове*

Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання: трыадзінства мэты, сувязь тэорыі з практыкай, прынцыпы навуковасці, сістэматычнасці, даступнасці, паслядоўнасці, нагляднасці, свядомасці і актыўнасці засваення, пераемнасці і перспектыўнасці і інш. Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання: ацэнкі выразнасці мовы, каардынацыі вуснай і пісьмовай мовы, апоры на этнакультуру, функцыянальна-камунікатыўнай накіраванасці, уліку фактару бікультурнага развіцця дзіцяці; накіраванасці працэсу навучання на паўнавартаснае фарміраванне і развіццё моўнай асобы школьніка; арыентацыі працэсу навучання на засваенне літаратурнай нормы з мэтай фарміравання асобы вучня як моўна-эстэтычнага ідэалу і інш.

Асноўныя метады выкладання, іх класіфікацыя і характарыстыка. Выкарыстанне наглядных дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў навучання, увядзенне элементаў праграмаванага навучання і алгарытмізацыі.

Прыёмы навучання: параўнанне і супастаўленне, аналіз і сінтэз, адасабленне і абстрагаванне, класіфікацыя і дыферэнцыяцыя, лінгвістычны эксперымент і інш. Спецыфічныя прыёмы навучання.

Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове. Дзесяцібальная сістэма і нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове. Віды, функцыі, метады кантролю і вызначэнне якасці моўнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 4. Планаванне праграмнага матэрыялу па беларускай мове. Арганізацыя выкладання беларускай мовы ў школе*

Каляндарнае планаванне праграмнага матэрыялу па мове. Тэматычнае планаванне работы настаўніка. Мэты і задачы планавання вучэбнага матэрыялу. Складанне плана-канспекта ўрока. Асноўныя структурныя кампаненты плана-канспекта. Вызначэнне тэмы і комплекснай мэты ўрока. Улік часу пры складанні плана-канспекта. Падбор дадатковага матэрыялу да ўрокаў. План-канспект да ўрока мовы.

Урок – асноўная форма вучэбнай работы ў школе. Сучасныя патрабаванні да ўрока. Структура ўрока ў залежнасці ад яго зместу, тэмы, мэты, этапаў навучання. Асноўныя тыпы ўрокаў у сувязі з працэсам засваення вучэбнага матэрыялу: урок вывучэння новага матэрыялу, урок замацавання, урок паўтарэння і абагульнення, урок праверкі ведаў і навыкаў, камбінаваны ўрок, урок развіцця мовы, урок аналізу пісьмовых работ (кантрольных дыктантаў, пераказаў, сачыненняў і інш.). Аналіз урока (структурны, аспектны, сістэмны, комплексны, экспрэс-аналіз).

Іншыя формы арганізацыі навучання: індывідуальныя заняткі (рэпетытарства, цьютарства, хатняе навучанне і інш.), калектыўна-групавыя заняткі: нетрадыцыйныя ўрокі (урокі-лекцыі, урокі-семінары, урокі-практыкумы і інш.), канферэнцыі, алімпіяды, цэнтралізаванае тэсціраванне і г.д.

## *Тэма 5. Вывучэнне фанетыкі і арфаэпіі*

Значэнне, мэты і задачы вывучэння фанетыкі і арфаэпіі ў школьным курсе беларускай мовы. Агульнаметадычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння гукавога боку мовы. Змест і будова курсаў фанетыкі і арфаэпіі. Супастаўленне фанетычных сістэм беларускай і рускай моў з мэтай папярэджання інтэрферэнцыі. Авалоданне нормамі літаратурнага вымаўлення, удасканаленне дыкцыі і ўменне валодаць голасам. Асноўныя метады і прыёмы вывучэння фанетыкі. Асноўныя віды фанетычных практыкаванняў. Фанетыка-графічны разбор і методыка яго правядзення.

Выкарыстанне тэхнічных сродкаў і наглядных дапаможнікаў пры вывучэнні фанетыкі і арфаэпіі.

Сувязь засваення фанетыкі і арфаэпіі з вывучэннем графікі, арфаграфіі, граматыкі, развіцця мовы і культуры маўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6. Вывучэнне лексікі і фразеалогіі*

Практычныя і пазнавальныя мэты і задачы вывучэння лексікі і фразеалогіі ў школе. Складанасці вывучэння лексікі і фразеалогіі. Спецыфічныя прынцыпы навучання лексіцы і фразеалогіі. Азнаямленне вучняў з лексічнымі паняццямі: адназначныя і мнагазначныя словы, ужыванне слоў у прамым і пераносным значэннях, амонімы, сінонімы, антонімы. Звесткі пра агульнаўжывальныя, прафесійныя, дыялектныя, устарэлыя словы і неалагізмы. Лексічныя практыкаванні. Методыка работы з тлумачальнымі слоўнікамі на ўроках беларускай мовы.

Методыка вывучэння фразеалогіі, знаёмства з крылатымі словамі і выразамі. Выпрацоўка навыкаў карыстання слоўнікамі розных тыпаў. Прыёмы навучання фразеалогіі. Методыка тлумачэння семантыкі незразумелых слоў.

### *Тэма 7. Асноўныя метады і прынцыпы навучання арфаграфіі*

Значэнне, этапы, мэты і задачы вывучэння арфаграфіі. Залежнасць метадаў і прыёмаў навучання арфаграфіі ад прынцыпаў яе пабудовы. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння арфаграфіі. Арфаграфічная норма. Знаёмства вучняў з арфаграфічным слоўнікам. Роля арфаграфічнага слоўніка для фарміравання арфаграфічных навыкаў. Дыктоўка, яе віды і методыка правядзення.

Арфаграфічны разбор і методыка яго правядзення. Арфаграфічныя памылкі ў работах вучняў, прыёмы іх папярэджання і выпраўлення. Грубыя і нягрубыя арфаграфічныя памылкі. Работа над арфаграфічнымі памылкамі.

### *Тэма 8. Выкладанне марфемікі і словаўтварэння*

Роля і месца раздзела ў курсе беларускай мовы. Лінгвістычныя асновы школьнага курса словаўтварэння, яго змест. Спецыфічныя прынцыпы вывучэння словаўтварэння. Словаўтваральная норма. Методыка работы з марфемным і словаўтваральным слоўнікамі. Тыпалогія словаўтваральных практыкаванняў.

Марфемны і словаўтваральны разборы слова, методыка іх правядзення. Роля аднакаранёвых і вытворных слоў у тэксце. Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў пры вывучэнні словаўтварэння. Выпрацоўка арфаграфічных уменняў і навыкаў пры вывучэнні словаўтварэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Задачы і мэты навучання марфалогіі*

Значэнне, задачы навучання марфалогіі ў школе. Спецыфічныя прынцыпы навучання марфалогіі. Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі.

Лінгвістычныя асновы школьнага курса марфалогіі. Асноўныя паняцці марфалогіі (часціны мовы, граматычная катэгорыя, граматычнае значэнне, словазмяненне) і методыка іх увядзення. Асаблівасці выкладання асобных часцін мовы.

Марфалагічная норма. Улік, класіфікацыя і работа над памылкамі марфалагічнага ўзроўню.

Тыпалогія марфалагічных практыкаванняў (пазнавальныя, класіфікацыйныя, аналітыка-сінтэтычныя). Марфалагічны разбор, методыка яго правядзення.

Фарміраванне арфаграфічных уменняў і навыкаў пры вывучэнні марфалогіі.

### *Тэма 10. Вывучэнне сінтаксісу і пунктуацыі*

Значэнне, мэты, задачы вывучэння сінтаксісу ў школьным курсе мовы. Методыка азнаямлення са словазлучэннем, простым і складаным сказам, сказам з простай мовай. Асноўныя метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу: аналіз і пабудова словазлучэнняў і сказаў, сінтаксічны разбор, выразнае чытанне розных сказаў, сінтаксічнае мадэляванне, графічная дыктоўка, сінтаксічная трансфармацыя, супрацьпастаўленне, абагульненне, сінтаксічны эксперымент, выпраўленне памылковых сказаў. Тыпалогія сінтаксічных практыкаванняў. Сінтаксічны разбор і методыка яго правядзення.

Этапы, змест і задачы навучання пунктуацыі. Спецыфічныя прынцыпы, метады і прыёмы навучання пунктуацыі. Пунктуацыйная норма. Пунктуацыйныя правілы, іх класіфікацыя і методыка работы над імі. Папярэджанне пунктуацыйных памылак, іх фіксацыя, улік. Грубыя і нягрубыя пунктуацыйныя памылкі.

### *Тэма 11. Развіццё звязнай вуснай і пісьмовай мовы вучняў на ўроках мовы*

Развіццё маўлення – адна з асноўных задач навучання роднай мове. Значэнне, задачы, змест работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пераказы ў сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабе перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, блізкія да тэксту; сціслыя; выбарачныя; з дадатковым заданнем) і інш. Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў.

Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення. Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпе тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанры (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія, рэпартаж і г. д.) і інш. Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў.

Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення. Навучанне камунікатыўным якасцям маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, дарэчнасць, багацце, выразнасць), маўленчаму этыкету. Тыпы практыкаванняў па фарміраванні камунікатыўных здольнасцей, методыка іх правядзення.

Праверка і ацэнка творчых прац вучняў . Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

### *Тэма 12. Методыка пазакласнай работы і факультатыўныя заняткі па беларускай мове*

Значэнне і задачы пазакласнай работы па беларускай мове. Прынцыпы арганізацыі пазакласнай работы.

Сувязь пазакласнай работы з вывучэннем мовы на ўроках. Асноўныя віды і формы пазакласнай работы па мове: альбомы, выстаўкі, насценныя газеты, вечары, алімпіяды і інш.

Месца факультатываў у сістэме навучання беларускай мове і літаратуры ў школе. Змест, мэты і задачы факультатываў. Метады і прыёмы правядзення факультатываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Раздзел II. Методыка выкладання беларускай літаратуры

### *Тэма 13. Методыка выкладання беларускай літаратуры як навуковая дысцыпліна*

Змест і задачы методыкі выкладання беларускай літаратуры. Методыка выкладання літаратуры – навука педагагічнага цыкла, яе сувязь з беларускай літаратурай, псіхалогіяй і педагогікай, іншымі прадметамі гуманітарнага цыкла. Гісторыя развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры. Дзейнасць Я. Коласа, І.І.Замоціна, І.К.Самковіча, В.У.Івашына, М.А.Лазарука і інш.

### *Тэма 14. Настаўнік і вучні на ўроках літаратуры. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры*

Прафесіяграма настаўніка беларускай літаратуры, агульнадыдактычныя, вузкаспецыяльныя патрабаванні. Чытацкія асаблівасці вучняў у залежнасці ад узросту.

Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры, нарматыўныя дакументы, вучэбная праграма, падручнікі, хрэстаматыі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, навуковыя кнігі, інфармацыйна-даведачная літаратура. Кабінет беларускай мовы і літаратуры.

### *Тэма 15. Прынцыпы і метады выкладання беларускай літаратуры. Тыпы і віды ўрокаў па літаратуры*

Агульнадыдактычныя прынцыпы: навуковасці, даступнасці і сістэмнасці, свядомай і актыўнай дзейнасці вучняў пры вядучай ролі настаўніка, нагляднасці, выхаваўчай накіраванасці.

Прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу: прынцып вывучэння твораў як відаў мастацтва слова; прынцып аналізу твора ў яго адзінстве зместу і формы; прынцып гістарызму. Метады выкладання: метад творчага чытання, эўрыстычны метад, даследчы метад, рэпрадуктыўны метад.

Віды ўрокаў па дыдактычных мэтах: урок тлумачэння новага матэрыялу, урок абагульнення і сістэматызацыі; урок-паўтарэнне. Урок камбінаванай будовы, кантрольны ўрок.

Урокі акадэмічнага тыпу: урок-лекцыя, урок-семінар, урок-залік.

Віды ўрокаў па вядучым метадзе: урок-гутарка, урок-дыспут і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віды ўрокаў па форме пазакласнай працы: урок-турнір, урок-спектакль і інш.

Нетрадыцыйныя ўрокі: урок-прэзентацыя, урок-інтэрв’ю і інш.

Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры.

### *Тэма 16. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па беларускай літаратуры. Планаванне працы настаўніка. Улік і ацэнка ведаў*

Адукацыйныя тэхналогіі і іх сутнасць: традыцыйныя тэхналогіі і іх адрозненне ад нетрадыцыйных. Нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу: тэхналогія перспектыўных ліній, тэхналогія модульнага навучання, праца па Дальтон-плане, французская майстэрня.

Планаванне (каляндарнае, перспектыўнае, бягучае). Віды і ўзроўні ўліку ведаў.

### *Тэма 17. Аналіз мастацкага твора на ўроках літаратуры. Метады і прыёмы*

Асноўныя патрабаванні да аналізу мастацкага твора: агульныя патрабаванні, непасрэдныя патрабаванні. Падрыхтоўчы этап, тыповы парадак аналізу твора. Уступныя заняткі і іх віды, методыка правядзення. Вывучэнне ўспрымання мастацкага твора вучнямі, асноўныя аспекты.

Метады і прыёмы аналізу мастацкага твора, іх характарыстыка (чытанне, пераказ і мастацкае расказванне, гутарка, дыспут, ілюстраванне і інш.).

### *Тэма 18. Шляхі аналізу мастацкага твора*

Шлях аналізу і яго сутнасць. Шлях «следам за аўтарам», павобразны шлях, кампазіцыйны шлях, аглядны шлях, шлях свабоднага аналізу, камбінаваны шлях.

Праца па вывучэнні вобраза-персанажа мастацкага твора ў сярэдніх і старшых класах.

### *Тэма 19. Вывучэнне твораў розных жанраў*

Вывучэнне вуснай народнай творчасці. Спецыфіка вывучэння лірычных, эпічных, драматычных твораў. Вывучэнне баек, агляддных і манаграфічных тэм. Вывучэнне біяграфіі пісьменніка, манаграфічныя тэмы. Спецыфіка заключных заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 20. Вывучэнне тэорыі літаратуры*

Значэнне вывучэння тэорыі літаратуры. Вывучэнне тэорыі літаратуры ў 5–9 класах. Вывучэнне літаратурна-крытычных прац. Вывучэнне тэорыі літаратуры ў 10–11 класах.

### *Тэма 21. Факультатыўныя заняткі па літаратуры*

Агульныя патрабаванні да правядзення факультатываў. Мэты і тэмы правядзення факультатываў. Формы і этапы правядзення факультатываў.

### *Тэма 22. Пазакласная і пазашкольная работа па беларускай літаратуры. Нагляднасць на ўроках літаратуры і ў пазакласнай рабоце*

Патрабаванні да арганізацыі пазакласнай работы. Планаванне пазакласнай работы. Формы і віды пазакласных заняткаў па літаратуры (масавыя, групавыя, камерныя, індывідуальныя, па колькасці ўдзельнікаў, па часе правядзення і г.д.). Узаемадзеянне ўрокаў пазакласнай і пазашкольнай работы. Сувязь урокаў літаратуры з пазакласным чытаннем.

Месца літаратурнага краязнаўства і яго роля ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Формы і віды краязнаўчай работы. Нагляднасць на ўроках літаратуры і ў пазакласнай рабоце.

Выкарыстанне сумежных відаў мастацтва на ўроках літаратуры і ў пазакласнай рабоце з вучнямі.

### *Тэма 23. Развіццё маўлення вучняў на ўроках літаратуры*

Спецыфіка развіцця вуснага маўлення праз выпрацоўку ўмення добра гаварыць, развіцця лагічнага і вобразнага мыслення, выхавання літаратурнага густу.

Развіццё пісьмовага маўлення вучняў. Класіфікацыя творчых прац па літаратуры і іх адметнасць. Тэхналогія навучання розным жанрам творчых прац. Агульная структура (увядзенне паняцця, азнаямленне і аналітычнае назіранне, планаванне і назапашванне матэрыялу і г.д.).

Напісанне эсэ і сачыненняў, будова сачынення, яго віды.

Развіццё маўлення лагічнага тыпу.

Самастойная праца з крыніцай (артыкулам, кнігай). Складанне тэзісаў, рэфератаў. Падрыхтоўка да вуснага выступлення. Даклады (інфарматыўныя, даследчыя і праблемна-дыскусійныя), методыка іх падрыхтоўкі. Патрабаванні да тэстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура да І раздзела

*Асноўная*

1. *Методыка* выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

2. *Яленскі, М.Г.* Методыка выкладання беларускай мовы: практыкум: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М.Г. Яленскі, У.П. Саўко, Л.С. Васюковіч; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2006. – 336 с.

*Дадатковая*

1. *Абабурка, М.* Культура беларускай мовы / М. Абабурка. – Мінск: Выш. шк., 1994. – 122 с.

2. *Асновы* культуры маўлення і стылістыкі: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ / У.Анічэнка [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 255 с.

3. *Валочка, Г.М.* Навучанне перакладу ў школе: дапаможнік для настаўнікаў / Г.М. Валочка. – 2-е выд. – Мінск: НМЦэнтр, 1999. – 103 с.

4. *Валочка, Г.М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5–10 класы / Г.М. Валочка. – Мінск: НІА, 2005. – 201 с.

5. *Варановіч, З.Б.* Методыка выкладання беларускай мовы / пад рэд. Л.М.Шакуна / З.Б. Варановіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 247 с.

6. *Варановіч, З.Б.* Тэматычны даведнік-дапаможнік для настаўнікаў беларускай мовы (5–11 кл.) і ВНУ / З.Б. Варановіч. – Гродна: Мельнікаў, 1997. – 111 с.

7. *Васюковіч, Л. С.* Беларуская мова ў 5 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Л. С. Васюковіч, В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 143 с.

8. *Воителева, Т.М.* Теория и методика обучения русскому языку: учеб. пособие для вузов / Т.М. Воителева. – М.: Дрофа, 2006. – 319 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. *Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я.М. Лаўрэль, Т.Р. Новікава, С.А. Язерская. – Мінск : Нар. асвета, 1991. – 134 с.

10. *Выкладанне* беларускай мовы ў школе / М.Г. Яленскі, Л.С. Васюковіч, І.М. Саматыя [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Нар. асвета, 1994. – 239 с.

11. *Вярбіла, У.М.* Багата, родная ты мова: матэрыялы і метадычныя парады па развіцці звязнай мовы вучняў, 4–8 кл. / У.М. Вярбіла, Я.М. Лаўрэль, М.Г. Яленскі. – Мінск: Нар. асвета, 1988. – 176 с.

12. *Гамеза, Л.М.* Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў 5–7 класаў / Л.М. Гамеза. – Мінск: БДУ, 2002. –132 с.

13. *Даніловіч, М.А.* Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы / М.А. Даніловіч. – Мінск: Нар. асвета, 1981. – 96 с.

14. *Ермаловіч, А.В.* Сачыненні-апісанні: тэорыя і практыка навучання: дапаможнік для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з рускай мовай навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / А.В. Ермаловіч. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2006. – 159 с.

15. *Кавалевіч, З. М.* Вывучэнне лічэбніка ў школе: дапаможнік для настаўніка / З.М. Кавалевіч. – Мінск: Нар. асвета, 2000. – 142 с.

16. *Кечык, С.Я.* Моўны разбор у ВНУ і ў школе: Схемы, узоры, заданні: вучэб. дапам. для студэнтаў спец. «Беларус. мова і літ.» пед. ін-таў / С.Я. Кечык, В.І. Рагаўцоў. – Мінск: Выш. шк., 1988. – 127 с.

17. *Красней, В.П.* Беларуская мова ў 6 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль, С. Р. Рачэўскі. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 128 с.

18. *Красней, В.П.* Грані слова: факультатыўны курс «Лексіка і фразеалогія беларускай мовы» / В.П. Красней. – Мінск: Нар. асвета, 1986. – 175 с.

19. *Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я.М. Лаўрэль, Т.Р. Новікава, С.А. Язерская; [Рэдкал.: М.А. Лазарук і інш.]. – Мінск: Нар. асвета, 1991. – 160 с.

20. *Литневская, Е.И.* Методика преподавания русского языка в школе: учеб. пособие для студентов высших учебных заведений / Е.И. Литневская, В.А. Багрянцева. – М.: Академ. проект, 2006. – 590 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. *Ляшчынская, В.А.* Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Беларуская філалогія» / В.А. Ляшчынская, З.У. Шведава. – Мінск: Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2007. – 251 с.

22. *Ляшчынская, В.А.* Педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў / В.А. Ляшчынская, В.І. Смыкоўская. – Мінск: Выш. шк., 1983. – 111 с.

23. *Ляшчынская, В.А.* Практыкаванні па лексіцы і стылістыцы: дапаможнік для настаўніка / В.А. Ляшчынская, А.А. Станкевіч. – Мінск: Нар. асвета, 1984. – 160 с.

24. *Малажай, Г.М.* Лінгвістычны аналіз тэксту: вучэб. дапам. для філал. фак. педінстытутаў па спец. 02.19 «Беларус.мова і літ.» / Г.М. Малажай. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 1992. – 367 с.

25. *Малажай, Г.М.* Пазакласная праца па беларускай мове: вучэб. дапам. для пед. ін-таў па спец. 02.19 «Беларус. мова і літ.» / Г.М. Малажай, С.Р. Рачэўскі. – Мінск: Выш. шк., 1990. – 253 с.

26. *Мартынкевіч, С.В.* Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5–6 класы): вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С.В. Мартынкевіч. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 102 с.

27. *Міцкевіч, К.* Методыка роднае мовы / К. Міцкевіч. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1926. – 138 с.

28. *Міцкевіч, К.* Методыка роднае мовы / К. Міцкевіч, В. Тэпін. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1930. – 223 с.

29. *Настольная* кніга настаўніка беларускай мовы і літаратуры: метадычныя рэкамендацыі і нарматыўныя патрабаванні / аўт.-склад. С.І. Цыбульская. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: СэрВит, 2009. – 288 с.

30. *Протчанка, В.У.* Актуальныя пытанні тэорыі і практыкі выкладання беларускай мовы ў школе / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 211 с.

31. *Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу складанага сказа ў 9 класе: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання з 11-гадавым тэрмінам навучання / В.У. Протчанка. – 2-е выд. – Мінск: Нар. асвета, 2004. – 158 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

32. *Протчанка, В.У.* Выкладанне беларускай мовы і літаратуры / В.У. Протчанка, У.Ц. Піскун, М.Г. Яленскі [і інш.] / пад рэд. М.А. Лазарука. – Мінск: Нар. асвета, 1983. – 176 с.

33. *Саўко, У.П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка): дапаможнік для настаўнікаў / У.П. Саўко. – Мінск: Беллітфонд, 2000. – 108 с.

34. *Теория* и практика обучения русскому языку: учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / Е.В. Архипова, Т.М. Воителева, А.Д. Дейкина [и др.]; под ред. Р.Б. Саботкоева. – М.: Академия, 2005. – 320 с.

## Літаратура да II раздзела

*Асноўная*

1. *Голубков, В.В.* Методика преподавания литературы / В.В. Голубков. – 7 изд., доп. и перераб. – М.: Учпедгиз, 1962. – 169 с.

2. *Лазарук, М.А.* Урок літаратуры ў школе / М.А. Лазарук. – Мінск: Нар. асвета, 1995. – 148 с.

3. *Методыка* выкладання беларускай літаратуры: вучэб. дапам. / пад рэд. В.Я.Ляшук. – Мінск: Асар, 2002. – 356 с.

4. *Методика* преподавания литературы: пособие для студентов и преподавателей: в 2 ч. / под ред. О.Ю. Богдановой, В.Г. Маранцмана. – М.: Просвещение, 1995. – 320 с.

5. *Методика* преподавания литературы: учебник для студентов пед. ин-тов / под ред. З.Я. Рез. – 2 изд. – М.: Просвещение, 1985. – 366 с.

6. *Міхайлаў, М.Р.* Практыкум па методыцы выкладання беларускай літаратуры: дапаможнік для студэнтаў / М.Р. Міхайлаў. – Мінск: Нар. асвета, 1987. – 121 с.

7. *Руцкая, А.В.* Беларуская літаратура ў школьным выкладанні: вучэб.-метад. дапам. / А.В. Руцкая, М.У. Грынько, М.Г. Бубешка. – Гродна: [б.в.], 2006. – 106 с.

*Дадатковая*

1. *Аляхновіч, Р.В.* Творы сумесных відаў мастацтваў на ўроках літаратуры / Р.В. Аляхновіч // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры / пад рэд. М.А. Лазарука. – Мінск: НДІ педагогікі, 1983. – С. 158–175.

2. *Арцімёнак, Г.М.* Тэарэтычныя веды як аснова спасціжэння мастацкага твора / Т.М. Арцімёнак // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе: новыя падыходы і тэндэнцыі: зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі. – Мінск: НІА, 2008. – С. 13–16.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Аскірка, В.* Вывучэнне біяграфіі пісьменнікаў з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхналогіі: на прыкладзе біяграфіі Максіма Багдановіча. XI клас / В. Аскірка // Роднае слова. – 2007. – № 4 . – С. 44–45.

4. *Бельскі, А.І.* Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры (структура, склад, крытэрыі і паказчыкі ацэнкі якасці) / А.І. Бельскі, І.Л. Шаўлякова-Барэенка // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 2. – С. 3– 8.

5. *Буслакова, Т.П.* Как анализировать лирическое произведение: учеб. пособие / Т.П. Буслакова. – М.: Просвещение, 2005. – 200 с.

6. *Гарадніцкі, Я.А.* Выкарыстанне катэгорыі «мастацкі свет» пры аналізе літаратуры / Я.А. Гарадніцкі // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе: новыя падыходы і тэндэнцыі: зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі. – Мінск: НІА, 2008. – С. 41–45.

7. *Грынько, М.У.* Вывучэнне біяграфіі пісьменніка / М.У. Грынько // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 6. – С. 50–52.

8. *Грынько, М.У.* Выкарыстанне тэхналогіі праектаў як адзін з аспектаў падрыхтоўкі студэнтаў да краязнаўчай працы (на прыкладзе жыцця і творчасці Элізы Ажэшка) / М.У. Грынько // Краязнаўства як адзін з кірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ: матэрыялы рэсп. навук. канф. (Брэст, 28–29 сак. 2008 г.) / пад рэд. У.А. Сенькаўца. – Брэст, 2008. – С. 20–25.

9. *Замоцін, І.І.* Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні / І.І. Замоцін. – Мінск: Белдзяржвыд, 1927. – 122 с.

10. *Клышка, А.К.* Лірычны твор на ўроку / А.К. Клышка // Вывучэнне літаратуры / пад рэд. В.У. Івашына. – Мінск: НДІ педагогікі, 1980. – С. 91–136.

11. *Ляшук, В.Я.* Вывучэнне аглядавых тэм / В.Я. Ляшук. – Мінск: Нар. асвета, 2002. – 230 с.

12. *Ляшук, В.Я.* Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе / В.Я. Ляшук. – Мінск: Нар. асвета, 1994. – 146 с.

13. *Ляшук, В.Я.* Лабараторныя заняткі па методыцы выкладання беларускай літаратуры / В.Я. Ляшук. – Мінск: Нар. асвета, 1988. – 206 с.

14. *Міхайлаў, М.Р.* Практыкум па методыцы выкладання беларускай літаратуры / М.Р. Міхайлаў. – Мінск: Нар. асвета, 1987. – С. 24–28.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. *Мішчанчук, М.І.* Аб некаторых праблемах вывучэння лірыкі ў старшых класах сярэдняй школы і ВНУ / М.І. Мішчанчук // Беларуская мова і літаратура. – 2001. – № 2. – С. 15–17.

16. *Новік, М.І.* Міжпрадметныя сувязі на ўроках беларускай літаратуры / М.І. Новік // Вывучэнне беларускай мовы і літаратуры ў школе / пад рэд. Я.А. Лазарук. – Мінск: НІА, 1988. – С. 44–55.

17. *Праблемнае* навучанне на ўроках беларускай літаратуры. – Мінск: Нар. асвета, 2002. – 163 с.

18. *Руцкая, А.В.* Заключныя заняткі ў сістэме працы над творам / А.В. Руцкая // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 3. – С. 20–23.

19. *Руцкая, А.В.* Пазакласная праца па беларускай літаратуры / А.В. Руцкая. – Мінск: Нар. асвета, 2000. – 164 с.

20. *Руцкая, А.В.* Праблематызацыя вучэбнага матэрыялу як сродак паглыблення аналізу мастацкага твора (на прыкладзе твораў Янкі Купалы) / А.В. Руцкая // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я.Купалы. – Гродна, 2009. – С. 132–136.

21. *Трафімчык, Т.У.* Работа над словам-вобразам на занятках літаратурнага гуртка / Т.У. Трафімчык // Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе: матэрыялы рэсп. навук. канф. (30 кастр. 2002 г.) / пад рэд. У.І. Каляды, Т.І. Тамашэвіча. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2003. – С. 47–53.

22. *Тэсты* па беларускай літаратуры: за і супраць // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 10. – С. 33–42.

23. *Якушина, Л.С.* Использование экранных и звуковых средств на уроках литературы / Л.С.Якушина. – М.: Просвещение, 1985. – 184 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТАДЫКА ВЫКЛАДАННЯ**
**БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11- 04 Бібліятэказнаўства*
*і бібліяграфія (філалогія і лінгвістыка),*
*спецыялізацыі 1-23 01 11-04 01Беларуская мова і літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 02.2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,96. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.